Андрэй ЧУТКІ

# МІТРАФАН ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ – заснавальнік першай ва Украіне эканамічнай ВНУ

*У Беларусі Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі вядомы ў першую чаргу як выдатны гісторык і этнограф, адзін з заснавальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі. Менш вядома пра яго дзейнасць па стварэнню і арганізацыі розных навучальных устаноў. Яго роля ў справе заснавання Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў (пазней Кіеўскага камерцыйнага інстытута) раскрываецца ў дадзеным артыкуле.*

У 2012 г. адзначалася 145-годдзе з дня нараджэння выдатнага беларускага гісторыка Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага (1867—1934). Нарадзіўшыся ў невялікім беларускім гарадку Рэчыца, ён неўзабаве пасля нараджэння разам з бацькамі пераехаў у Кіеў — горад, з якім аказаўся звязаны значны перыяд яго жыцця. Менавіта тут ён атрымаў сярэднюю і вышэйшую адукацыю (на гістарычна-філалагічным факультэце Кіеўскага імператарскага ўніверсітэта св. Уладзіміра), стаў адным з вучняў і паслядоўнікаў гістарычнай школы У.Б.Антановіча[1]. Пасля непрацяглага побыту ў Маскве, дзе ён працаваў у архіўных установах і пачаў выкладчыцкую дзейнасць, Доўнар-Запольскі вярнуўся ў 1901 г. у Кіеў, дзе жыў да 1918 г.

Гэты другі кіеўскі перыяд у яго жыцці быў надзвычай плённы — яшчэ адносна малады чалавек, але ўжо даволі сталы і энергічны даследчык — хацеў пакінуць след у любімай ім гісторыі. Пры гэтым варта адзначыць, што ў гэты час ён асабліва зацікавіўся эканамічнай гісторыяй. Актыўна ўспрымаў нямецкі вопыт, у прыватнасці грунтоўна вывучаў працы прадстаўнікоў нямецкай гістарычнай школы, аб чым можна меркаваць на аснове аналізу яго даследаванняў у галіне народнай гаспадаркі (нават сам гэты тэрмін, які ён выкарыстоўваў, быў запазычаны ў нямецкіх эканамістаў). Падобнае запазычанне было цалкам апраўдана (засноўвалася на бліскучым і эканамічным прарыве Германіі, здзейсненым у вельмі сціслы тэрмін да пачатку XX ст.) і было прынята большасцю гісторыкаў і эканамістаў Расійскай Імперыі. У гэты час М.Доўнар-Запольскі захапіўся ідэяй стварэння эканамічнай ВНУ. Ён адзначаў: "*...колоссальные успехи немцев на мировом рынке — можно без преувеличения сказать — обязаны именно знаниям... И в этом привлечении знаний в торговое дело несомненно значительную роль сыграли специальные школы, в виде торговых академий*"[2]. Такім чынам, ідэя стварэння эканамічнай ВНУ была не сляпым пакланеннем, а асэнсаваным перайманнем нямецкага вопыту ў важнай справе развіцця эканамічнай адукацыі.



***ЧУТКІ Андрэй Іванавіч.***

*Дырэктар Музея гісторыі Кіеўскага нацыянальнага (КНЭУ) эканамічнага ўніверсітэта імя Вадзіма Гецьмага, дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі гаспадаркі гэтага ж універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1976 г. . У 1998 г. закончыў гістарычны факультэт Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, у 2002 г. — аспірантуру пры ім. У 2003 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму: "М.П.Дашкевіч: асоба, навуковая і педагагічная спадчына вучонага". З 1999 г. выкладае ў розных навучальных установах г. Кіева. З 2006 г. працуе ў КНЭУ. Даследуе гісторыю прафесарскай карпарацыі і студэнцтва Кіева другой паловы XIX — пачатку XX ст., гісторыю Кіеўскага камерцыйнага інстытута, эканамічную гісторыю Украіны. Аўтар каля 70 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфіі, зборніка дакументаў, чатырох вучэбных дапаможнікаў.*

Аб тым, што М.Доўнар-Запольскі даўно захапіўся сферай камерцыйнай (у сучасным прачытанні — эканамічнай) адукацыі, сведчаць нядаўна выяўленыя і да гэтага часу невядомыя нават буйным даследчыкам яго жыцця і дзейнасці факты. Як было выяўлена, упершыню цікавасць М.Доўнар-Запольскага да сферы камерцыйнай адукацыі праявілася яшчэ да яго вяртання ў Кіеў. Прытым гэта была не проста цікавасць: 25 студзеня 1895 г. ён падаў заяву кіраўніцтву Першага кіеўскага камерцыйнага вучылішча з просьбай даць яму магчымасць выкладаць *"историю и историю торговли или географии"*[3]. Прычым вучылішча пачало сваю работу толькі з верасня 1896 г., г.зн. Доўнар-Запольскі ўважліва сачыў за справай развіцця камерцыйнай адукацыі ў Кіеве, знаходзячыся ў гэты час у Маскве.

Па-сапраўднаму сур'ёзна М.В.Доўнар-Запольскі падышоў да справы камерцыйнай адукацыі пасля вяртання ў Кіеў і ўмацавання свайго становішча ў горадзе. Заняцце кафедры ў Кіеўскім імператарскім універсітэце св. Уладзіміра (1901 г.), абарона доктарскай дысертацыі (1905 г.) далі яму магчымасць заняць дастойнае месца ў асяроддзі кіеўскай грамадскасці. Гэта было абумоўлена, па-першае, самім статусам універсітэцкага прафесара: паводле заканадаўства Расійскай Імперыі, ардынарны прафесар меў чын пятага класа (сапраўдны саветнік)[4]. Па-другое, асаблівай актыўнасцю самога Мітрафана Віктаравіча. Як адзначаў у гэтай сувязі вядомы даследчык яго жыцця і дзейнасці С.І.Міхальчанка: *"Довнар-Запольский в киевский период весьма популярен: он читает много публичных лекций, берет участие в работе ряда общественных организаций"*[5]. Гэта значыць яму ўдалося наладзіць кантакты як сярод прадпрымальнікаў, так і сярод чыноўнікаў, што забяспечыла поспех яго справе як у плане акумуляцыі сродкаў для стварэння ў горадзе навучальнай установы эканамічнага профілю, так і ў плане аблягчэння ў атрыманні дазволу на яе стварэнне.

Усё гэта супала з надзвычай спрыяльнымі знешнімі абставінамі: расійская дэмакратычная рэвалюцыя 1905—1907 гг. вымусіла ўлады пайсці на шэраг саступак, у прыватнасці, у 1905 г. была спрошчана працэдура адкрыцця прыватных навучальных устаноў. А ў 1906 г. было створана Міністэрства гандлю і прамысловасці, якому перадаваліся ў падпарадкаванне ўсе навучальныя ўстановы эканамічнай (камерцыйнай) спецыялізацыі і якое стала адным з самых ліберальных у Расійскай Імперыі, з'яўляючыся прыстанкам для многіх апазіцыйна настроеных вучоных. Менавіта гэтыя фактары і сталі апошнімі аргументамі для ажыццяўлення даўно саспелай ідэі — стварэння ў Кіеве ВНУ камерцыйнага профілю. Кіеўскія прадпрымальнікі выйшлі з гэтай ініцыятывай яшчэ ў 1880-х гг.[6], але рэалізаваць яе ўдалося толькі ў 1906 г. М.Доўнар-Запольскаму.

Праўда, сам працэс заснавання Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў аказаўся даволі заблытаным. Як вынікае з чарнавікоў аўтабіяграфіі М.Доўнар-Запольскага, знойдзеных у яго архіве, які захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Украіны ў Кіеве, ён яшчэ ў 1903—1904 гг. *"начал хлопотать об утверждении в Киеве вечерних высших коммерческих курсов, но только в 1905 г. получил разрешение от Министерства народного просвещения на открытие женских курсов с коммерческим отделением"*[7]. Апошняе пацвярджаецца і іншымі архіўнымі дакументамі, якія змяшчаюць інфармацыю пра праект гэтай навучальный установы і адначасова паказваюць, што ён так і застаўся на ўзроўні праекта[8]. Як вынікае з дакументаў, што адносяцца да справы стварэння Доўнар-Запольскім вячэрніх жаночых курсаў у Кіеве, гаворка пра заснаванне камерцыйных курсаў у той час яшчэ не ішла[9]. Пасля перапіскі з кіеўскім губернатарам і генерал-губернатарам, а таксама папячыцелем Кіеўскай навучальнай акругі, якая працягвалася з лета па верасень 1905 г., 7 кастрычніка 1905 г. (г. зн. практычна адразу ж пасля выдання вядомага маніфеста расійскага імператара Мікалая II пра наданне шэрага свабод падданым) кіеўскі генерал-губернатар паведаміў пра сваю згоду на адкрыццё ў Кіеве *"женских общеобразовательных курсов профессора Университета св. Владимира Довнар-Запольского"*[10].

Але, верагодна, гэтае рашэнне не зусім задавальняла Доўнар-Запольскага. Па-першае, відавочна, што яму як прафесару вядомага ўніверсітэта ўсё ж хацелася кіраваць ВНУ, а не звычайнымі курсамі. Па-другое, ён хацеў, каб яны мелі крыху іншую спецыялізацыю. І нарэшце, па-трэцяе, сам фармат адкрываемай навучальнай установы адразу ж аказваўся пройгрышным у сувязі з аднačасовым аднаўленнем дзейнасці Кіеўскіх вышэйшых жаночых курсаў, якія мелі аўтарытэт, традыцыі і значную падтрымку[11].

Да таго ж адкрываць навучальную ўстанову, падпарадкаваную Міністэрству народнай асветы, найбольш рэакцыйнаму міністэрству Расійскай імперыі, у той час таксама было не зусім мэтазгодна. У гэты час адбывалася стварэнне вышэй названага Міністэрства гандлю і прамысловасці (больш ліберальнага па сваёй сутнасці). Паколькі навучальныя ўстановы камерцыйнага профілю падпарадкоўваліся апошняму, то лёс заснаванай М.Доўнар-Запольскім у Кіеве навучальнай установы быў прадвызначаны — яна ўзнікла адразу ж пасля стварэння Міністэрства гандлю і прамысловасці (гэтае міністэрства было заснавана 28 кастрычніка 1905 г., а прашэнне пра адкрыццё Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў, падпісанае Доўнар-Запольскім, датавана 11 лютага 1906 г.) і заканамерна ў фармаце камерцыйнай навучальнай установы. Да таго ж падобная спецыялізацыя адразу ж ставіла яе ў спрыяльнае становішча — у выніку пераадолення сусветнага эканамічнага крызісу 1900—1903 гг. і паступовага адраджэння эканомікі Расійскай Імперыі рэзка ўзрастаў попыт на спецыялістаў у розных галінах народнай гаспадаркі.



МИНИСТЕРСТВО ТОРГОВЛИ и ПРОМЫШЛЕННОСТИ.

Отдѣлъ УЧЕБНЫЙ.

Отдѣленіе Столъ 2.

12 Августа 1906 г.

№3745

Въ Канцелярію Кіевскаго, Подольскаго и Волынскаго Генералъ-Губернатора.

Учебный Отдѣлъ имѣетъ честь препроводить при семъ въ Канцелярію Кіевскаго, Подольскаго и Волынскаго Генералъ - Губернатора копію съ утвержденнаго Министерствомъ Торговли и Промышленности устава высшихъ коммерческихъ курсовъ М. В. Довнаръ - Запольскаго въ г. Кіевѣ.

И.о.Временно - Управляющаго Отдѣломъ

За Начальника Отдѣленія

*Дазвол Міністэрства гандлю і прамысловасці на заснаванне Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў.*
12 жніўня 1906 г.

Так ці інакш, але, як вынікае з дакументаў канцылярыі кіеўскага генерал-губернатара, 11 лютага 1906 г. М.Доўнар-Запольскі падаў прашэнне пра заснаванне Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў. Яно адрасавалася праз губернатарскую канцылярыю на імя міністра гандлю і прамысловасці Расійскай Імперыі М.М.Фёдарава, чалавека высокаадукаванага і ліберальных поглядаў[12]. 28 лютага гэтае прашэнне было пераадрасавана ад кіеўскага генерал-губернатара міністру гандлю і прамысловасці. Пасля пэўнай перапіскі і праходжання ўсіх адпаведных працэдур (знаёмства з асобай заснавальніка, вывучэнне праекта Статута ўстановы і г.д.) 12 жніўня 1906 г. з вучэбнага аддзела Міністэрства гандлю і прамысловасці прыйшоў зацверджаны Статут *"Высших коммерческих курсов М.В. Довнар-Запольского в г. Киеве"*[13]. Мітрафан Віктаравіч заняў пасаду дырэктара Курсаў. Затрымку з вырашэннем пытання аб адкрыцці Курсаў можна растлумачыць як пачаткам згортвання саступак, зробленых уладамі ліберальным колам грамадства, так і зменамі ў кіраўніцтве Міністэрства гандлю і прамысловасці (у ім за першае паўгоддзе 1906 г. змянілася тры міністры — В.І.Ціміразеў, М.М.Фёдараў і Д.А.Філосафаў).

У выніку прыём абітурыентаў на вучобу ў Кіеўскія вышэйшыя камерцыйныя курсы ўдалося пачаць толькі з 26 жніўня 1906 г., г. зн. літаральна за некалькі дзён да пачатку вучэбнага года. Тым не менш Курсы пачалі работу паспяхова: былі арандаваны памяшканні, закуплена неабходнае абсталяванне, сфарміраваны прафесарска-выкладчыцкі штат (прадстаўлены пераважна прафесарамі і дацэнтамі Кіеўскага імператарскага ўніверсітэта св. Уладзіміра і Кіеўскага політэхнічнага інстытута[14], што адразу ж фактычна прыраўняла Курсы да разраду вышэйшых навучальных устаноў)[15]. Даволі аператыўна ўдалося набраць і студэнтаў, прыток якіх узрастаў у геаметрычнай прагрэсіі: з 221 у пачатку работы Курсаў[16] да 991 у 1908 г.[17], г. зн. на момант іх рэарганізацыі ў Кіеўскі камерцыйны інстытут[18].

Тым не менш і пасля пачатку паўнавартаснай работы Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў М.Доўнар-Запольскаму не ўдалося застацца ў спакоі. Як ён сам пазней успамінаў: *"На административном поприще мне пришлось провести такую работу, какая редко приходится на долю других. Высшее учебное заведение началось без средств, без определенной программы, без определенного состава преподавателей. Пришлось разрабатывать программу, устанавливать предметы преподавания, подбирать преподавательский персонал, налаживать учебную машину"*[19]. І гэта была не проста рэпліка на публіку. Як паказваюць архіўныя дакументы і сведчанні сучаснікаў, яму і ў далейшым даводзілася ў многім толькі сваімі сіламі вырашаць розныя справы гэтай навучальнай установы: займацца рэарганізацыяй Курсаў у Інстытут, ураўнаваннем яго ў правах з дзяржаўнымі ВНУ і г.д. Бо, нягледзячы на стварэнне навучальнай установы, яна не была аднесена да разраду вышэйшых юрыдычна, хоць і была такой фактычна ў сілу дамінавання сярод выкладчыкаў асоб, якія выкладалі ў іншых кіеўскіх ВНУ, і праграм выкладання, адаптаваных менавіта да вышэйшай школы (што прадугледжвалася і Статутам Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў, і тым больш пазней — Кіеўскага камерцыйнага інстытута)[20].

Паводле Статута Кіеўскага камерцыйнага інстытута, тэрмін навучання ў ім складаў чатыры гады. Сам вучэбны план быў пабудаваны *"применительно к семестровой системе"*, г. зн. ва ўсім была відавочнай прамая аналогія з прынцыпамі выкладання ў вышэйшай школе[21]. У той жа час у адрозненне ад усіх існуючых ВНУ Расійскай Імперыі ў Кіеўскі камерцыйны інстытут прымалі прадстаўнікоў абодвух палоў[22], у чым праявілася наватарства Доўнар-Запольскага. Дарэчы, у момант адкрыцця Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў улады *"сомневались в возможности поручить частному лицу разрешение на обучение обоих полов. К тому же и не ожидалось существенного приплыва лиц мужского пола, особенно в связи с открытием университетов для выпускников всех средних учебных учреждений"*[23]. Такім чынам, падобнае рашэнне патрабавала мужнасці і прадбачлівасці. І як паказалі далейшыя падзеі, М.Доўнар-Запольскі апярэдзіў у гэтым рашэнні сваю эпоху.

Смеласць і разуменне важнасці арганізацыі эканамічнай ВНУ для будучага, праяўленыя М.Доўнар-Запольскім у арганізацыі Кіеўскага камерцыйнага

інстытута, былі прызнаны ўжо сучаснікамі. Так адзін з паплечнікаў Доўнар-Запольскага ў справе стварэння Інстытута і другі рэктар гэтай ВНУ П.Р.Слёзкін так ацэньваў першыя гады яе існавання: *"В условиях создания новое учреждение не имело в своем распоряжении ни значительных финансовых средств, ни свободных вполне от других обязанностей лиц преподавательского состава; вместе с тем и отсутствие педагогического опыта в новом направлении не давали возможности поставить дело с самого начала на надлежащую высоту. Поэтому вполне понятно, что существование и развитие учреждения с самых первых шагов имело характер стихийного явления ... иногда оно казалось на краю погибели, иногда вдруг возносилось на волне общественного сочувствия на значительную высоту"*[24].

Толькі 12 мая 1908 г. М.Доўнар-Запольскі, выкарыстоўваючы свае асабістыя сувязі ў кіеўскіх і вышэйшых эшалонах улады, дамогся рэарганізацыі Курсаў у Кіеўскі камерцыйны інстытут[25], але і пасля гэтага ўжо амаль ВНУ (§ 41 Статута Інстытута спецыяльна ўказваў, што *"в число преподавателей института ... избираются лица, которые имеют право преподавать в высших учебных учреждениях")*[26] не была такім з пункту гледжання права — яна не прыраўноўвалася да існуючых ВНУ і як вынік — яе выпускнікі не мелі правоў выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў.

Але нягледзячы на ўсе складанасці, колькасць студэнтаў гэтай навучальнай установы пастаянна павялічвалася: 221 у 1906 г.[27], 404 у пачатку 1908 г.[28], 2758 восенню 1910 г.[29], 3269 восенню 1912 г.[30] і больш за 4000 восенню 1914 г.[31]. Вучэбны план базіраваўся на прынцыпах прадметнага выкладання і на комплексе трох груп вучэбных дысцыплін: эканамічных, юрыдычных і камерцыйна-тэхнічных. Тэарэтычная падрыхтоўка злучалася з практычнай, што прадугледжвала частыя экскурсіі на розныя прадпрыемствы, а таксама накіраванне найбольш паспяховых студэнтаў у замежныя камандзіроўкі. Усе гэтыя асаблівасці сведчылі аб запазычанні ў арганізацыі вучэбнага працэсу менавіта нямецкага вопыту. Дарэчы, у Германіі эканамічныя ВНУ таксама засноўваліся дзякуючы прыватнай ініцыятыве і як прыватныя навучальныя ўстановы.

Прафесарска-выкладчыцкі склад інстытута папаўняўся вядомымі асобамі: у перыяд паміж 1909—1914 гг. на працу ў інстытут прыйшлі выдатныя вучоныя ў розных галінах ведаў: А.М.Гіляроў, Д.А.Граве, А.А.Русаў, Я.Я.Слуцкі, Л.М.Яснапольскі і шэраг іншых.

Усё гэта давала кіраўніцтву навучальнай установы права прэтэндаваць на пераўтварэнне яе ў паўнавартасную ВНУ. Але працэс гэты быў такім жа складаным, як і справа заснавання Курсаў. І зноў асноўныя намаганні прыкладаў іх заснавальнік М.Доўнар-Запольскі.

Рашаючая роля М.Доўнар-Запольскага ў гэтай справе прызнавалася ўжо сучаснікамі. Так, вышэй узгаданы П.Р.Слёзкін канстатаваў: *"К.К.* (Киевский Коммерческий. — **А.Ч.**) *институт, наследник Высших Коммерческих Курсов, возник к жизни в силу своевременно осознанной его основателем общественной потребности в систематизированном высшем коммерческом образовании"*[32]. 30 мая 1910 г., выступаючы на пасяджэнні Савета прафесараў Кіеўскага камерцыйнага інстытута па пытанню яго ўраўнавання ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, М.Доўнар-Запольскі прама крытыкаваў пасіўнасць выкладчыкаў у вырашэнні гэтага пытання[33]. Прытым Доўнар-Запольскі адзначыў рознабаковую работу, праведзеную ім асабіста для яго станоўчага вырашэння.



МИНИСТЕРСТВО
ОВЛИ И ПРОМЫШЛЕННОСТИ.
ОТДѢЛЪ
УЧЕБНЫЙ.
по части
ЫСШИХЪ УЧЕБНЫХЪ
ЗАВЕДЕНІЙ.
мая 1908 г.
№ [redacted]

Группа профессоровъ Высшихъ Коммерческихъ Курсовъ въ г. Кіевѣ ходатайствовала объ открытіи, вмѣсто сихъ курсовъ, Кіевскаго Коммерческаго Института, уставъ коего, въ виду сего ходатайства, былъ, по докладу Учебнаго Отдѣла, утвержденъ Вашимъ Высокопревосходительствомъ 12 сего мая. Съ открытіемъ сего Института, вышеназванные Коммерческіе Курсы въ настоящее время подлежатъ закрытію.

Объ изложенномъ Учебный Отдѣлъ имѣетъ честь представить на благоусмотрѣніе Вашего Высокопревосходительства.

Управляющій Отдѣломъ

Начальникъ Отдѣленія

*Інфармацыя аб рэарганізацыі Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў у Кіеўскі камерцыйны інстытут.*
12 мая 1908 г.

Важнасць пытання ўраўнавання Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў правах з дзяржаўнымі ВНУ тлумачылася тым, што асобы, якія закончылі Інстытут, не атрымлівалі статуса выпускнікоў ВНУ з усімі наступствамі, якія з гэтага вынікалі, у прыватнасці, не мелі правоў на заняцце адпаведных пасад. У выніку ўзнікалі непаразуменні і нават канфліктныя сітуацыі паміж студэнтамі (якіх адміністрацыя Кіеўскага камерцыйнага інстытута запэўнівала, што яны паступаюць у вышэйшую навучальную ўстанову і якія былі ў гэтым упэўнены) і асабліва студэнтамі старшых курсаў (якія ўсведамлялі, што яны не атрымаюць пасля выпуску тых правоў, на якія разлічвалі), з аднаго боку, і адміністрацыяй Кіеўскага камерцыйнага інстытута — з другога (паколькі студэнты лічылі, што ім былі дадзены лжывыя абяцанні). Менавіта гэта і пры-

мушала М.Доўнар-Запольскага як кіраўніка Інстытута прадаўжаць барацьбу за прадастаўленне яму ўсіх правоў ВНУ, на якія гэтая навучальная ўстанова магла прэтэндаваць па вышэй пералічаных прычынах.

Падштурхоўвала да паскарэння вырашэння гэтага пытання і сітуацыя ў самім Інстытуце, якая асабліва абвастрылася ў 1910 г., калі споўніліся чатыры гады з часу заснавання гэтай навучальнай установы. Нагадаем, што поўны адукацыйны цыкл у ёй (як і ў астатніх тагачасных ВНУ) складаў менавіта чатыры гады. Адбыўся першы выпуск студэнтаў, аднак выпускнікі Інстытута не атрымалі такіх жа правоў, як і выпускнікі дзяржаўных ВНУ. Заканамерна, што падобная сітуацыя магла істотна пагоршыць імідж Кіеўскага камерцыйнага інстытута сярод яго абітурыентаў. І яны, як дакладваў М.Доўнар-Запольскі перад Саветам прафесараў Кіеўскага камерцыйнага інстытута, у першую чаргу высвятлялі пытанне аб тым, якія правы яны атрымаюць, скончыўшы Інстытут. Таму малейшае зацягванне з вырашэннем пытання аб ураўнаванні Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, як адзначаў у гэтай сувязі на пасяджэнні Савета прафесараў інстытута Доўнар-Запольскі, магло выклікаць адток тых, хто ўжо вучыўся на дадзены момант, апатыю і хваляванне нават сярод самых спакойных элементаў.

І гэта былі не пустыя фразы — восенню 1909 г. у Кіеўскім камерцыйным інстытуце адбыліся хваляванні сярод студэнтаў, асабліва старшых курсаў, якія неўзабаве павінны былі заканчваць вучобу з-за нявызначанасці іх статуса пасля заканчэння Кіеўскага камерцыйнага інстытута. Ва ўмовах, калі інтэнсіўна развіваўся Маскоўскі камерцыйны інстытут і Адэскія вышэйшыя камерцыйныя курсы, ішла падрыхтоўка да пачатку работы Харкаўскага камерцыйнага інстытута, а таксама існавала магчымасць атрымаць эканамічную адукацыю за мяжой, Кіеўскі камерцыйны інстытут мог стаць неканкурэнтаздольным, згубіўшы асноўную частку патэнцыяльных абітурыентаў і нават тых студэнтаў, якія ўжо вучыліся ў ім (і на чым справядліва акцэнтаваў увагу членаў Савета прафесараў Інстытута М.Доўнар-Запольскі).

Важна адзначыць, што для недапушчэння падобнага развіцця падзей Доўнар-Запольскі лічыў жыццёва неабходным не толькі ўраўнаванне Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, але і папаўненне яго выкладчыцкага складу новымі кадрамі, а таксама ўмацаванне матэрыяльнай базы Інстытута. Як паказала далейшая гісторыя, гэтыя задачы выконваліся паспяхова. У прыватнасці, менавіта ў 1910—1912 гг. завяршылася стварэнне сядзібы Кіеўскага камерцыйнага інстытута шляхам набыцця сумежных участкаў зямлі з пабудовамі (якія былі пераабсталяваны для патрэб навучальнай установы) на рагу вуліцы Пірагоўскай і Бібікаўскага бульвара[34].

Але першачарговай задачай заставалася ўраўнаванне ў правах Кіеўскага камерцыйнага інстытута з дзяржаўнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Расійскай Імперыі. Як вынікае з дакументаў, зацягванне гэтай справы ў значнай ступені адбывалася не толькі з-за супрацьдзеяння адпаведных дзяржаўных органаў, але і з-за недастатковага разумення асноўнай масай прафесарска-выкладчыцкага складу Інстытута важнасці гэтай справы і яе інертнасцю, у выніку чаго прафесары і выкладчыкі адмаўляліся падтрымліваць гэтае патрабаванне перад уладамі. У выніку М.Доўнар-Запольскаму фактычна даводзілася самастойна вырашаць справу па прадастаўленню Кіеўскаму камерцыйнаму інстытуту ўсіх правоў вышэйшай навучальнай установы.

Яшчэ ў студзені 1910 г. Міністэрства гандлю і прамысловасці паведаміла аб адкладзе разгляду праекта Палажэння аб Кіеўскім камерцыйным інстытуце[35]. З боку Савета прафесараў Інстытута ніякіх крокаў для выпраўлення сітуацыі прынята не было. Таму 30 мая 1910 г. М.Доўнар-Запольскі быў вымушаны




*Будынак Кіеўскага камерцыйнага інстытута.* Паштоўка пачатку XX ст.

спецыяльна звярнуцца ў Савет прафесараў Інстытута з лістом, у якім абвінавачваў членаў Савета ў нежаданні падтрымліваць ідэю прадастаўлення Інстытуту ўсіх правоў вышэйшай навучальнай установы, у *"нежелании совета принимать хотя бы какое-нибудь, но конкретное решение"*[36].

Прытым М.Доўнар-Запольскі, які ў той час знаходзіўся ў Пецярбургу, дзе вырашалася справа аб ураўнаванні Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, у сваім звароце да Савета прафесараў Інстытута адзначыў, што сам міністр гандлю і прамысловасці* з-за нявызначанасці з гэтай справай у інстытуцкім асяроддзі *"задержал движение вопроса о правах института"*[37]. М.Доўнар-Запольскі нагадваў, што пры вырашэнні справы аб рэарганізацыі Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў у Кіеўскі камерцыйны інстытут *"в министерстве положение дел было таким же угрожающим, но Совет Высших коммерческих курсов поддержал директора своим мнением, дело было решено, и мы получили устав института"*. Далей Доўнар-Запольскі ў гэтым звароце расказваў, як развіваліся яго перамовы адносна прадастаўлення Інстытуту правоў дзяржаўных ВНУ. Ён высветліў, што для станоўчага вырашэння справы трэба было растлумачыць міністру гандлю і прамысловасці сітуацыю са студэнцкім кантынгентам і прафесарска-выкладчыцкім складам Інстытута**, а таксама заручыцца падтрымкай прадстаўнікоў горада і гандлёва-прамысловых колаў, што і было зроблена ім асабіста.

Варта падкрэсліць, што з гэтага звароту М.Доўнар-Запольскага ў Савет прафесараў Інстытута можна зрабіць выснову, што афіцыйныя ўлады Кіева (губернатар і шэраг іншых службовых асоб) інфармавалі Міністэрства аб "нядобранадзейнасці" студэнцтва Інстытута[38]. Пацвярджаецца гэта і ўспамінамі яго былых студэнтаў[39] і ў комплексе сведчыць на карысць правільнасці створанага зборнага партрэта студэнцтва Кіеўскага камерцыйнага інстытута[40], значнай часткі якога былі ўласцівы дэмакратызм і пэўная радыкальнасць поглядаў.

Прывёўшы гэтыя факты, М.Доўнар-Запольскі адзначаў, што яму ўдалося абвергнуць негатыўнае ўяўленне аб Кіеўскім камерцыйным інстытуце ў Міністэрстве гандлю і прамысловасці і адначасова заручыцца падтрымкай гарадской думы і гандлёва-прамысловых колаў Кіева. Ён адзначаў таксама неабходнасць больш цеснай сувязі Інстытута *"с той сферой деятельности, для которой он готовит учеников, не имея общения с представителями этой деятельности, мы сами слишком уклоняемся в теоретическую постановку преподавания и наконец не готовим для выпускников благоприятной почвы для практического применения их знаний"*[41]. Такім чынам, Доўнар-Запольскі фактычна прадказаў сучасны падыход у сферы вышэйшай адукацыі, які характарызуе створанае ім ВНУ і цяпер, а менавіта — прадастаўленне магчымасці для студэнтаў пра-



*Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі.* Фота перыяду кіраўніцтва ім Кіеўскім камерцыйным інстытутам.

ходзіць практыку па абранай спецыяльнасці, каб набыць практычны вопыт дзейнасці.

Як вынікае з гэтага звароту М.Доўнар-Запольскага ў Савет прафесараў Кіеўскага камерцыйнага інстытута, 4 мая 1910 г. было праведзена пасяджэнне Савета, у якім ён тэлеграмай да міністра гандлю і прамысловасці ці іншым чынам павінен быў падтрымаць "пытанне аб правах".

Аднак у адказ на гэту прапанову М.Доўнар-Запольскага члены Савета прафесары А.А.Эйхельман (юрыст) і У.А.Касінскі (палітэканом) паставілі пытанне аб адмаўленні ад хадайніцтва перад Міністэрствам гандлю і прамысловасці аб атрыманні Інстытутам усіх правоў вышэйшай навучальнай установы. Думкі многіх членаў Савета таксама схіляліся на іх бок, і ў рэшце рэшт гэта паўплывала на большасць Савета, якую Мітрафан Віктаравіч называў "тормазам" гэтага працэсу. Савет прапаноўваў дырэктару выкарыстаць неафіцыйныя шляхі для вырашэння гэтага пытання[42].

Такім чынам, праз гісторыю Кіеўскага камерцыйнага інстытута можна рэканструяваць і асобныя складаючыя псіхалагічнага партрэта М.Доўнар-Запольскага і іншых асоб, якія працавалі ў камерцыйным інстытуце (адначасова і ў іншых ВНУ) — праз іх адносіны да свайго афіцыйнага месца работы, нават калі іх работа ў Інстытуце і прадстаўляла другое месца работы.

Вяртаючыся да абставін барацьбы за ўраўнаванне Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, адзначым, што Доўнар-Запольскі тлумачыў халатныя адносіны членаў

* Міністрам на той час быў С.І.Цімашаў — вядомы расійскі дзяржаўны дзеяч, фінансіст і банкір. Ён добра разбіраўся ў эканамічных пытаннях, у прыватнасці разумеў важнасць развіцця эканамічнай адукацыі, але адначасова не ўспрымаў хістанняў у высунутых ініцыятывах.

** Маецца на ўвазе ліберальны падыход кіраўніцтва Інстытута пры камплектацыі прафесарска-выкладчыцкага штата і пры наборы студэнтаў, у выніку якога парушаліся прынятыя ў Расійскай Імперыі правілы. Дакладней лібералізм кіраўніцтва Інстытута пайшоў значна далей за лібералізм самага ліберальнага з мінітэрстваў Расійскай Імперыі. Таму міністэрства патрабавала адпаведнай карэкціроўкі дзеянняў кіраўніцтва Інстытута адносна камплектацыі выкладчыкамі і набору студэнтаў.

**Одобренный Государственнымъ Совѣтомъ и Государственною Думою и ВЫСОЧАЙШЕ утвержденный законъ.**

**Объ установленіи Положенія и штата Кіевскаго Коммерческаго Института.**

На подлинномъ Собственною Его Императорскаго Величества рукою написано: *„БЫТЬ ПО СЕМУ“.*

Въ Царскомъ Селѣ.
3 Іюня 1912 года.

Скрѣпилъ: Государственный Секретарь, Сенаторъ *Крыжановскій.*

ОДОБРЕННЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫМЪ СОВѢТОМЪ И ГОСУДАРСТВЕННОЮ ДУМОЮ

**ЗАКОНЪ**

**объ установленіи Положенія и штата Кіевскаго Коммерческаго Института.**

I. Установить прилагаемые при семъ Положеніе и штатъ Кіевскаго Коммерческаго Института.

II. Предоставить Министру Торговли и Промышленности опредѣлить срокъ и порядокъ введенія въ дѣйствіе—полностью или по частямъ—указанныхъ въ отдѣлѣ I Положенія и штата.

Подписалъ: Предсѣдатель Государственнаго Совѣта

*М. Акимовъ.*

На подлинномъ Собственною Его Императорскаго Величества рукою написано: *„БЫТЬ ПО СЕМУ“.*

Въ Царскомъ Селѣ.
3 Іюня 1912 года.

Скрѣпилъ: Государственный Секретарь, Сенаторъ *Крыжановскій.*

*Закон ад 3 чэрвеня 1912 г. аб зацвярджэнні Статута і штата Кіеўскага камерцыйнага інстытута.* ("Известия Киевского коммерческого института". Кн. 17. К., 1912).

Савета прафесараў Інстытута да гэтага пытання іх заспакоенасцю ад дасягнутых ВНУ поспехаў, у прыватнасці стабільна ўзрастаючым прытокам абітурыентаў. У адказ на гэта Доўнар-Запольскі пісаў: *"наш успех у молодёжи базируется не на том, что нами сделано, а на ее уверенности, что мы можем сделать"*[43], падкрэсліваючы, што студэнты чакаюць ад кіраўніцтва Інстытута завяршэння гэтай справы, тады як яе зацягванне *"повлечет не только отток студентов, но и недовольство, брожение и апатию в среде более спокойных элементов"*[44]. Ён выказваў занепакоенасць тым, што іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы камерцыйнага профілю (Маскоўскі і будучы Харкаўскі камерцыйныя інстытуты, Адэскія вышэйшыя камерцыйныя курсы) перацягнуць асноўную масу абітурыентаў у выпадку невырашэння пытання аб прадастаўленні Кіеўскаму камерцыйнаму інстытуту новага Статута, які ўраўнаваў бы яго ў правах з дзяржаўнымі ВНУ. І ў выніку *"наш прием сведется к 2—3 сотням учеников, из которых половина будут вольнослушателями"*[45].

Адзначым, што сітуацыя ў Кіеўскім камерцыйным інстытуце ў 1910—1912 гг. у цэлым была нестабільнай: адбываліся хваляванні ў студэнцкім асяроддзі (асабліва вострыя з восені 1910 г.), на што ўказваюць данясенні кіеўскага гарадскога жандарскага ўпраўлення і іншых структур[46].

Пэўныя канфлікты ў гэты час мелі месца і ў асяроддзі прафесарска-выкладчыцкага складу Інстытута. І размова не толькі пра канфлікт паміж Доўнар-Запольскім і Эйхельманам. Так, з перапіскі паміж прафесарам Егіазаравым і Доўнар-Запольскім вынікае, што да сярэдзіны студзеня 1911 г. прафесары Кіеўскага камерцыйнага інстытута Каткоў, *Воблы*

*Дыплом выпускніка Кіеўскага камерцыйнага інстытута.*
1914 г.



# ДИПЛОМЪ.

Данъ сей дипломъ Нестеренко Аркадію Васильевичу, сыну чиновника, вѣроисповѣданія православнаго, прослушавшему полный курсъ наукъ въ Кіевскомъ Коммерческомъ Институтѣ по КОММЕРЧЕСКО-ТЕХНИЧЕСКОМУ отдѣленію въ томъ, что онъ, Нестеренко, подвергался курсовымъ испытаніямъ по нижеслѣдующимъ предметамъ: по Богословію пять. По коммерческой ариѳметикѣ пять. По группѣ экономическихъ наукъ: по теоріи политической экономіи съ исторіей пять, по исторіи хозяйственнаго строя Россіи четыре, по исторіи хозяйственнаго строя Западной Европы три, по статистикѣ пять. По группѣ юридическихъ наукъ: по энциклопедіи права три, по гражданскому праву четыре, по русскому государственному праву три, по общему ученію о государствѣ пять, по международному праву четыре, по финансовому праву четыре. По группѣ естественныхъ и техническихъ наукъ: по физикѣ пять, по химіи неорганической четыре, по химіи органической три, по машиновѣдѣнію пять, по электротехникѣ пять. По новымъ языкамъ: по французскому—пять, по итальянскому—четыре.

По общему счетоводству, практической геологіи, финансовымъ вычисленіямъ,- подвергался коллоквіуму. По политической экономіи, (по теоретической ея части и прикладной), по статистикѣ, по политической ариѳметикѣ, по гражданскому праву, по торговому праву, финансовому праву, въ лабораторіяхъ по химіи аналитической и технической, по товаровѣдѣнію—выполнилъ практическія занятія, а также практическія работы въ кабинетахъ.

На основаніи Высочайше утвержденнаго въ 3 день іюня мѣсяца 1912 г. Положенія о Кіевскомъ Коммерческомъ Институтѣ и правилъ, утвержденныхъ Господиномъ Министромъ Торговли и Промышленности 10 [illegible] 1913 г., онъ, Нестеренко, подвергался въ январѣ, февралѣ и мартѣ мѣсяцахъ 1914 года окончательнымъ экзаменамъ въ Испытательной Коммиссіи по: торговому праву три, экономической географіи [illegible] политикѣ три, товаровѣдѣнію съ технологіей четыре, и счетоводству (общему) пять.

По сему на основаніи ст. 27 Высочайше утвержденнаго въ 3 день іюня мѣсяца 1912 г. [illegible] установленіи Положенія о Кіевскомъ Коммерческомъ Институтѣ г. Нестеренко опредѣленіемъ Испытательной Коммиссіи при Коммерческо-техническомъ Отдѣленіи 10-го марта 1914 года, состоявшимся и одобреннымъ Учебнымъ Комитетомъ Института 19-го марта 1914 года, удостоенъ званія коммерческаго инженера второго разряда.

На основаніи Высочайшаго соизволенія, послѣдовавшаго 29 іюня 1914 г. лицамъ окончившимъ курсъ наукъ въ Кіевскомъ Коммерческомъ Институтѣ предоставляются слѣдующія права на чинопроизводство: окончившимъ со званіемъ коммерческаго инженера по первому разряду—чинъ X класса и по второму разряду—чинъ XII класса при опредѣленіи на государственную службу на штатныя должности техниковъ.

Указанными правами пользуются лица, окончившія курсъ Кіевскаго Коммерческаго Института при дѣйствіи Высочайше утвержденнаго 3 іюня 1912 г. положенія о Кіевскомъ Коммерческомъ Институтѣ. *(Сообщеніе Учебнаго Отдѣла Министерства Торговли и Промышленности отъ 15 іюля 1914 г. за № 1783* на имя и. о. Директора Кіевскаго Коммерческаго Института).

Въ удостовѣреніе сего и данъ сей дипломъ г. Нестеренко за надлежащими подписями и приложеніемъ печати Кіевскаго Коммерческаго Института.

Ноября мѣсяца 13 дня 1914 г. № 464

Директоръ
Кіевскаго Коммерческаго Института, профессоръ

Предсѣдатель Испытательной Коммиссіи,
Деканъ Коммерческо-техническаго отдѣленія, профессоръ

Правитель Дѣлъ

і Самафалаў падалі заяву аб спыненні выкладання ў Інстытуце і выхадзе са складу яго выкладчыкаў[47]. У сувязі з гэтым Егіазараў заяўляў, што зможа аднавіць працу ў Інстытуце толькі пасля таго, як вышэйназваныя асобы забяруць свае заявы аб зыходзе і таксама адновяць работу ў Інстытуце, паколькі *"при наличии тех условий, побудивших их подать такого рода заявление, для меня также невозможна служба в Киевском коммерческом институте"*[48]. На жаль, іншыя дакументы, якія маглі б праліць святло на гэтыя падзеі, не знойдзены.

Зацягванне справы аб прадастаўленні Інстытуту ўсіх правоў дзяржаўных ВНУ было выклікана і фактарамі знешнімі. Да іх адносіліся, па-першае, чарговае наступленне рэакцыі ў Расійскай Імперыі, і, па-другое, частыя змены кіраўніцтва Міністэрства гандлю і прамысловасці, якое разглядала падобныя пытанні (са студзеня 1908 па студзень 1909 г. міністрам гандлю і прамысловасці быў І.П.Шыпаў, са студзеня па лістапад 1909 г. — В.І.Ціміразеў, з лістапада 1909 па люты 1915 г. — С.І.Цімашаў). Заканамерна, што падобная цякучасць кіруючых кадраў ускладняла вырашэнне важных пытанняў, да якіх адносілася і прадастаўленне правоў дзяржаўнай ВНУ прыватнай ВНУ, якой быў Кіеўскі камерцыйны інстытут.

Аднак у Кіеўскім камерцыйным інстытуце прадаўжаліся работы, закліканыя засведчыць перад уладамі сур'ёзны ўзровень пастаноўкі як навукі, так і навучальнага працэсу ў Інстытуце. Працягвалася ўмацаванне прафесарска-выкладчыцкага штату новымі асобамі. З сакавіка па май 1912 г. у інстытуце дзейнічала спецыяльная камісія (у яе ўваходзілі Доўнар-Запольскі, Воблы, Ягораў, Ерчанка, Русаў, Слёзкін, Яснапольскі) па перагляду праграм выкладання, іх ап-



*Нагрудны знак выпускніка Кіеўскага камерцыйнага інстытута.*

тымізацыі (ліквідацыі паралелізму ў падачы матэрыялаў па розных дысцыплінах, наданню цэласнасці і большай канкрэтыкі вучэбным праграмам і г.д.), каб яны сталі больш актуальнымі і адпаведнымі апошнім дасягненням у адпаведных навуках[49]. Былі ўпарадкаваны экзаменацыйныя сесіі і здача выпускных экзаменаў: дакладна вызначаўся час іх правядзення (з 10 па 20 студзеня і з 10 па 31 мая, а ў асаблівых выпадках у снежні па асобных прадметах і з 25 жніўня па 1 верасня па выпускных[50]), а таксама пералік прадметаў па якіх здаваліся экзамены (з прадстаўленнем праграм па кожнаму прадмету). 18 мая 1912 г. прапановы гэтай камісіі былі накіраваны членам Савета прафесараў і Вучэбнага камітэта Інстытута і зацверджаны. Акрамя таго, кіраўніцтва Інстытута заручалася падтрымкай дзелавых колаў Кіева*, прадстаўнікоў мясцовай і цэнтральнай улад.

Нарэшце, у 1912 г. пытанне аб прадастаўленні Кіеўскаму камерцыйнаму інстытуту правоў дзяржаўнай ВНУ было вырашана станоўча (і, як бачым, у асноўным намаганнямі самога М.Доўнар-Запольскага, які ў выніку змог прыцягнуць да гэтай справы і Савет прафесараў Інстытута). 12 мая 1912 г. Інстытут прыраўнялі да дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў з адпаведным ураўнаваннем у правах выпускнікоў гэтага інстытута з выпускнікамі іншых ВНУ, што аўтаматычна павялічыла і прыток абітурыентаў (хоць у выніку ўзмацнення абмежаванняў на прыём у Інстытут асоб яўрэйскага паходжання гэтая тэндэнцыя была некалькі ўраўнаважана змяншэннем паступлення абітурыентаў, якія належалі да гэтай этнічнай меншасці, прадстаўнікі якой раней складалі каля 50% ад колькасці яго студэнтаў).

3 чэрвеня 1912 г. Палажэнне аб Кіеўскім камерцыйным інстытуце, якое ўраўнавала яго ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, было "высочайше утверждено"[51] — з гэтага моманту Інстытут у афіцыйнай дакументацыі абазначаўся як *"высшее учебное учреждение с правами государственных высших учебных учреждений"*. А 27 чэрвеня 1912 г. Міністэрства гандлю і прамысловасці зацвердзіла новы Статут Інстытута[52]. Гэтым канчаткова было ўзаконена ўраўнаванне дадзенага ВНУ ў правах з другімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Расійскай Імперыі, а значыць, і прадаставіла яго выпускнікам адпаведныя правы.

Што гэта давала Кіеўскаму камерцыйнаму інстытуту ў практычнай плоскасці? Па-першае, павышаўся рэйтынг Інстытута. Па-другое, яго выпускнікі ўраўноўваліся ў правах з выпускнікамі дзяржаўных ВНУ на атрыманне адпаведнага іх кваліфікацыі месца працы. Таксама яго студэнты набывалі правы на карыстанне разнастайнымі льготамі, якія мелі студэнты дзяржаўных ВНУ (ільготны праезд на гарадскім і чыгуначным транспарце, аблегчаныя ўмовы для перасоўвання ў межах імперыі і для выезду за мяжу, права на атрыманне дзяржаўных стыпендый і іншых субсідый і г.д.). Таму цалкам зразумелым становіцца жаданне студэнтаў у набыцці Інстытутам усіх правоў. Пры гэтым і час прадастаўлення новага статута быў самы ўдалы — як раз закончыліся выпускныя экзамены, і, такім чынам, чарговая партыя выпускнікоў змагла атрымаць тое, што ім абяцалі, — дыплом, які прадастаўляў ім тыя ж правы, што і выпускнікам дзяржаўных ВНУ.

Аднак канчатковы варыянт новага статута Кіеўскага камерцыйнага інстытута, якім ён ураўноўваўся ў правах з дзяржаўнымі ВНУ, меў і адмоўныя бакі — ён ставіў Інстытут пад больш жорсткі кантроль з боку дзяржаўных устаноў. Так, са складу Вучэбнага камітэта давялося вывесці шэраг асоб, якія лічыліся ўладамі "нядобранадзейнымі" (Русаў, Карчак-Чапуркоўскі). Ім было адмоўлена ў прадастаўленні прафесарскіх пасад у Інстытуце[53]. Такім чынам, пазбягаючы палітычнага ціску, улады выкарысталі чыста фармальныя падставы для ўшчамлення правоў апазіцыйных дзеячаў, якія знайшлі прытулак у Кіеўскім камерцыйным інстытуце, што стала магчымым менавіта пасля ўвядзення новага статута.

Яшчэ адным фактарам узмацнення кантролю з боку дзяржавы ў выніку ўвядзення новага статута стала абмежаванне пераліку асоб, якія маглі паступаць у яго (былі ўведзены паўсюль дзеючая працэнтная норма на прыём асоб яўрэйскага паходжання, узмоцненая праверка абітурыентаў на прадмет лаяльнасці да ўлад і г.д.). Для студэнтаў інстытута канчаткова стала абавязковым нашэнне ўніформы, што таксама садзейнічала больш жорсткаму кантролю з боку праваахоўных органаў.

* Каб зацікавіць прадпрымальнікаў у дзейнасці Інстытута, праграма выкладання ў ім грунтавалася на прынцыпе максімальнага набліжэння да жыцця. У выніку яго выпускнікі, заканчваючы Інстытут, з'яўляліся гатовымі спецыялістамі для розных сфер эканамічнага жыцця.



ОБЪЯВЛЕНІЕ.

Сообщаю г.г.слушателямъ Кіевскаго Коммерческаго Института, [illegible] постановленію Совѣта Министровъ и согласно распоряженія Господина [illegible]нистра Торговли и Промышленности, всякаго рода студенческія собранія [illegible] зданіи Института безусловно воспрещаются. Въ случаѣ устройства [illegible]бо собранія Институтъ отдается въ распоряженіе административной [illegible] и виновные въ этомъ слушатели, будутъ исключены изъ Института [illegible]тивнымъ порядкомъ со всѣми вытекающими изъ этого послѣдствіями [illegible]шеніе отсрочки, права жительства и проч.

1911-го года сентября 5-го дня.

Директоръ

*Аб'ява дырэктара Кіеўскага камерцыйнага інстытута аб забароне студэнцкіх сходаў.*

У выніку кіраўніцтва Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў асобе М.Доўнар-Запольскага пачало адцягваць увядзенне новага статута, каб не пашкодзіць сваім студэнтам і не зменшыць прыток абітурыентаў (што было шкодна, улічваючы самаакупнасць Кіеўскага камерцыйнага інстытута як прыватнага ВНУ, бо галоўнай крыніцай паступленняў фінансавых сродкаў была менавіта плата на навучанне). Такім чынам, і ў гэтай сітуацыі М.Доўнар-Запольскі імкнуўся дзейнічаць у інтарэсах Інстытута.



*Я.Д.Сташэўскі.* Фота пачатку XX ст.

І прытым — з пагрозай для сябе. Так, у адказ на прамаруджванне з увядзеннем новага статута 22 лістапада 1912 г. да яго звярнуліся прадстаўнікі правай студэнцкай арганізацыі — Саюза акадэмістаў Кіеўскага камерцыйнага інстытута з патрабаваннем-ультыматумам аб увядзенні новага статута. У выпадку далейшага прамаруджвання ў гэтай справе яны пагражалі перавесціся ў (як яны выказваліся) *"полноправный Московский коммерческий институт с весеннего семестра 1913 г."*[54].

У той жа час, нягледзячы на некаторую рэакцыйнасць новага статута, М.Доўнар-Запольскі разумеў, што той дае выпускнікам Інстытута значна большыя магчымасці, чым проста дыплом прыватнай навучальнай установы, як гэта было раней. А таму 26 лістапада 1912 г. ён звярнуўся да студэнтаў Інстытута з просьбай устрымацца ад любых хваляванняў у сувязі з увядзеннем новага Статута, паколькі Міністэрства гандлю і прамысловасці папярэдзіла, што ў выпадку ўзнікнення падобных хваляванняў увядзенне Статута будзе адтэрмінавана на адзін год[55]. Прытым, як вынікае з успамінаў блізкай знаёмай Мітрафана Віктаравіча Н.Палонскай-Васіленкі, замест 5% нормы для прыёма асоб яўрэйскага паходжання, якая дзейнічала ў ВНУ Кіева, Доўнар-Запольскі дамогся для Кіеўскага камерцыйнага інстытута 7% нормы, а ў выніку дазволу *"робити іспит 4 рази на рік: таким чином фактично 28% євреїв на рік діставали права"*[56]. Аднак гэтыя намаганні не былі ацэнены самімі студэнтамі яўрэйскага паходжання і, як узгадвала тая ж Палонская-Васіленка, з таго часу *"він* (Доўнар-Запольскі. — **А.Ч.**) *втратив популярність серед єврейської маси"*[57].

Яшчэ адным фактарам, які вёў да падрыву аўтарытэту М.Доўнар-Запольскага ў Кіеўскім камерцыйным інстытуце, сталі дзеянні аднаго з яго вучняў — выпускніка гістарычна-філалагічнага факультэта Кіеўскага імператарскага ўніверсітэта св. Уладзіміра Я.Д.Сташэўскага. Апошні не толькі абараніў дыплом-



Въ Попечительный Совѣтъ
...го коммерческаго института.

Въ виду освобожденія профессора М.В.Довнаръ-Запольскаго, согласно его ходатайству, отъ исполненія обязанностей директора Кіевскаго коммерческаго института, Учебный Отдѣлъ проситъ Попечительный Совѣтъ нынѣ же приступить къ выборамъ новаго директора, согласно ст. 48 устава института.

...ющій Отдѣломъ

...1917
2441

...Отдѣленія

*Распараджэнне Міністэрства гандлю і прамысловасці аб выбары новага дырэктара Інстытута.*
20 сакавіка 1917 г.

ную працу, а пазней і доктарскую дысертацыю дзякуючы падтрымцы М.Доўнар-Запольскага, але і быў запрошаны ім на працу ў Кіеўскі камерцыйны інстытут. Прычым некалькі гадоў ён проста лічыўся выкладчыкам Інстытута і ў той жа час працаваў над зборам матэрыялаў у архівах Масквы, адкуль незаконна вынес каля 300 архіўных дакументаў з розных дзяржаўных архіваў. Калі ж гэтыя яго дзеянні былі выкрыты, то Сташэўскі пачаў канфліктаваць са сваім настаўнікам, якога лічыў ініцыятарам нападак на сябе[58].

Калі ж пачалася рэвалюцыя 1917 г., то частка студэнтаў Кіеўскага камерцыйнага інстытута і Я.Сташэўскі вырашылі выкарыстаць змену ўлады, каб распачаць цкаванне М.Доўнар-Запольскага. Прытым першыя былі хутчэй вядомай групай, а Сташэўскі — яе ўмелым інспіратарам, расчышчаючы для сябе кар'ерны шлях. Як узгадвала Н.Палонская-Васіленка (якая блізка ведала Доўнар-Запольскага і якраз прыехала ў Кіеў у сакавіку 1917 г., г. зн. стала відавочніцай апісваемых ёю падзей): *"З перших часів революції в Комерційному інституті почалась справжня боротьба проти нього* (Довнар-Запольского — **А.Ч.**): *почались мітинги, на яких оголосили його співробітником охранки ... Довнара не впустили до інституту, не дали права виступити на мітингу. Дійшло до того, що студенти встановили контроль над тими, хто їде до нього, затримували на вулиці, обшукували. Лише таємно до нього приходили знайомі і від них він знав, що робиться в інституті. Там діяли в дружньому контакті агітатори з єврейського студентства та професор Сташевський"*[59].

Дарэчы, падобнай была сітуацыя і з кіраўнікамі іншых тагачасных ВНУ. Падобны лёс перажыў рэктар Кіеўскага ўніверсітэта Н.М.Цітовіч, якога з пачаткам лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. студэнты абвясцілі знятым з пасады і адмаўляліся ўпускаць яго ва ўніверсітэт. І хоць Цітовіча падтрымала большасць прафесараў універсітэта, ён усё ж склаў свае паўнамоцтвы і неўзабаве пакінуў універсітэт[60].

Менавіта такі лёс давялося перажыць і М.Доўнар-Запольскаму. Пад уздзеяннем часткі студэнцтва і Сташэўскага, у выніку страты падтрымкі ва ўрадавых эшалонах (якія пацярпелі кардынальныя змены), пакінуты большасцю сваіх сяброў, Мітрафан Віктаравіч выступіў на пасяджэнні Вучэбнага камітэта Інстытута 5 сакавіка 1917 г. са спецыяльнай заявай. У ёй ён раскрытыкаваў далучэнне студэнтаў да справы кіравання Інстытутам[61] і падаў заяву аб адстаўцы. З 20 са-

кавіка 1917 г. ён склаў абавязкі дырэктара Кіеўскага камерцыйнага інстытута[62]. Так завяршыўся перыяд яго кіраўніцтва Кіеўскімі вышэйшымі камерцыйнымі курсамі / Кіеўскім камерцыйным інстытутам, хоць яшчэ каля года ён быў звязаны з ім выкладаннем курса гісторыі гаспадарчага ладу Расіі і шэрага іншых курсаў. Але ў хуткім часе і яны былі адабраны ў яго Сташэўскім, які ў сваёй барацьбе з былым настаўнікам ішоў да канца. Так з 1919 г. прозвішча М.Доўнар-Запольскага ў спісах выкладчыкаў Кіеўскага камерцыйнага інстытута было перакрэслена, а насупраць дысцыплін, якія ён раней чытаў, упісана прозвішча Сташэўскага[63].

У 1919 г. Сташэўскі паслядоўна займаў спачатку пасаду сакратара камерцыйна-тэхнічнага факультэта Кіеўскага камерцыйнага інстытута (пры бальшавіках), а затым з верасня 1919 г. — дэкана таго ж факультэта (пры дзянікінцах)[64], што пацвярджае як яго беспрынцыповасць, так і кар'ерызм. Прытым ён паспеў зняць з пасады рэктара створанага пры Кіеўскім камерцыйным інстытуце Блізкаўсходняга інстытута, і заняць яе[65], што пацвярджаецца дакументальна і дае падставы абвергнуць раней высунутую гіпотэзу аб тым, што Сташэўскі быў рэктарам Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў перыяд восені—зімы 1919 г.[66], паколькі і ў той час заканадаўства забараняла сумяшчэнне дзвюх кіруючых пасад, а тым больш не дапускала кіраўніцтва адначасова дзвюма ВНУ адной асобай.

Варта адзначыць, што пасля адстаўкі М.Доўнар-Запольскага ў Кіеўскім камерцыйным інстытуце не ўдалося абраць новага дырэктара, нягледзячы на распараджэнне Міністэрства гандлю і прамысловасці ад 20 сакавіка 1917 г., якое патрабавала абрання новага дырэктара[67], і інстытутам да канца 1917 г. кіраваў як *"исполняющий обязанности директора"* П.Р.Слёзкін[68]. Ён, як і наступны паўнапраўны рэктар Кіеўскага камерцыйнага інстытута (са снежня 1917 г. па верасень 1919 г.) К.Воблы, быў запрошаны на працу ў Інстытут Доўнар-Запольскім і карыстаўся яго даверам. Значыць, можна гаварыць пра тое, што ў Інстытуце чакалі, што Доўнар-Запольскі пагодзіцца вярнуцца на пасаду дырэктара, а калі гэтага не адбылося (у 1917 г., ён, як вядома, узначаліў Археалагічны інстытут), кіраванне ВНУ было даверана тым асобам, якім давяраў сам Доўнар-Запольскі.

Робячы агульныя высновы аб ролі М.Доўнар-Запольскага ў справе станаўлення першага ва Украіне ВНУ эканамічнага профілю (якая існуе да гэтага часу і з'яўляецца вядучай эканамічнай ВНУ Украіны — гэта Кіеўскі нацыянальны эканамічны ўніверсітэт імя Вадзіма Гецьмана), варта прызнаць, што гэта была несумненная заслуга Мітрафана Віктаравіча. Менавіта ён змог рэалізаваць ідэю мясцовых прадпрымальніцкіх колаў, пасунуць яе з мёртвай кропкі, вынікам чаго стала стварэнне ў 1906 г. Кіеўскіх вышэйшых камерцыйных курсаў, якія ўжо праз два гады былі рэарганізаваны ў Інстытут, што з 1912 г. быў ураўнаваны ў правах з дзяржаўнымі ВНУ. Усё гэта было заслугай у першую чаргу М.Доўнар-Запольскага. Ён жа садзейнічаў стварэнню прадстаўнічага прафесарска-выкладчыцкага штату Інстытута, у склад якога ўвайшло шмат вядомых на ўсю Расійскую Імперыю вучоных-эканамістаў (Бажаеў, Слуцкі, Слёзкін, Яснапольскі і інш.), і не толькі (гісторык Бубноў, статыст Русаў, філосаф Гіляроў, матэматык Граве, юрыст Эйхельман і многія іншыя). Яму ўдалося стварыць і значны аўдыторны фонд — шляхам набыцця шэрага пабудоў у цэнтральнай частцы Кіева (справа, якая аказалася непасільнай ні для аднаго ВНУ ў Кіеве ў далейшым).


Митрофанъ Викторовичъ.
Имѣю честь увѣдомить Васъ,
...то Совѣтъ профессоровъ въ за-
...сѣданіи 7 марта с.г. постано-
...вилъ просить Васъ, приступить
...текущемъ семестрѣ къ чтенію
...раллельнаго курса экономиче-
...ой исторіи Россіи.
...профессоръ

*Прапанова ад кіраўніцтва Кіеўскага камерцыйнага інстытута М.Доўнар-Запольскаму адносна яго выкладання ў Інстытуце.*

Дзякуючы М.Доўнар-Запольскаму ўдалося шляхам адмовы ад абсурдных абмежаванняў (на прыняцце ў ВНУ асоб жаночага полу, а таксама прадстаўнікоў шэрага нацыянальнасцей) ператварыць маладую ВНУ ў найбольш вялікую навучальную ўстанову па колькасці студэнтаў у Кіеве. Такім чынам, можна гаварыць, што Кіеўскі камерцыйны інстытут у многім быў тварэннем М.В.Доўнар-Запольскага. Але, на жаль, крызіс старога комплексу маральных каштоўнасцей і культуры ў цэлым, выкліканы Першай сусветнай вайной і наступнымі рэвалюцыйнымі падзеямі, актывізаваў найбольш нізкія элементы, якія фактычна дамагліся адстаўкі М.Доўнар-Запольскага з пасады дырэктара Кіеўскага камерцыйнага інстытута ў сакавіку 1917 г.

---

[1] Михальченко С.И. Киевская школа. Очерки об историках. Брянск, 1994. С. 20.

[2] Довнар-Запольский М.В. Новый тип высшего образования // Речь, произнесенная в собрании киевского купеческого общества 23 мая 1907 г. К., 1907. С. 25—26.

[3] Государственный архив г. Киева (далей — ГАК). Ф. 94, оп. 4, д. 1, лл. 59—60.

[4] Щетинина Г.И. Университеты в России и устав 1884 года. М., 1976. С. 36.

[5] Михальченко С.И. М.В. Довнар-Запольский: историк и общественный деятель // Вопросы истории. 1993, № 6. С. 166.

[6] ГАК. Ф. 94, оп. 4, д. 1, л. 2.

[7] Центральный государственный исторический архив Украины в г. Киеве (далей — ЦГИАК). Ф. 262, оп. 1, д. 2, л. 1.

[8] ЦГИАК. Ф. 442, оп. 658, д. 176.

[9] ЦГИАК. Ф. 442, оп. 658, д. 176, лл. 1—27.

[10] Там же. Л. 15.

[11] Кобченко К.А. «Жіночий університет Святої Ольги»: історія Київських вищих жіночих курсів. К., 2007.

[12] ЦГИАК. Ф. 442, оп. 1, д. 123, л. 1.

[13] Там же. Л. 5.

[14] Чуткий А.І. Викладацькі кадри та склад студентства Вищих комерційних курсів у Києві (1906—1908 рр.) // Література та культура Полісся. Вип. 63. Ніжин, 2011. С. 218—229; Чуткий А.І. Університет Св. Володимира та Київський комерційний інститут: сприяння в становленні та оцінка співпраці // Часопис української історії. Вип. 22. К., 2012. С. 13—18.

[15] Чуткий А.І. Заснування Київських вищих комерційних курсів // Вісник Академії праці і соціальних відносин Федерації профспілок України. 2011, № 2. С. 143—149; Чуткий А.І. Київські вищі комерційні курси: від заснування до трансформації на Київський комерційний інститут // Вісник Академії праці і соціальних відносин Федерації профспілок України. 2011. № 3. С. 128—135.

[16] ГАК. Ф. 229, оп. 1, д. 19, л. 55 об.

[17] Там же. Л. 73.

[18] Чуткий А.І. Еволюція студентського контингенту Київського комерційного інституту // Київська старовина. 2010, № 1. С. 35—45.

[19] Матяш І.Б. Особа в українській архівістиці: Біографічні нариси. К., 2001. С. 88.

[20] Гл. § 41 Устава Киевского коммерческого института (ГАК. Ф. 153, оп. 8, д. 464, л. 32).

[21] ГАК. Ф. 229, оп. 1, д. 8, л. 1.

[22] Гл. § 11 Устава Киевского коммерческого института (ГАК. Ф. 153, оп. 8, д. 464, л. 30 об.).

[23] ГАК. Ф. 153, оп. 8, д. 129, лл. 18—19; Записка о Киевском коммерческом институте. К., 1910. С. 3.

[24] ГАК. Ф. 153, оп. 8, д. 129, л. 9 — 9 об.

[25] Там же. Д. 2, л. 53.

[26] Там же. Д. 464, л. 32.

[27] Там же. Ф. 229, оп. 1, д. 19, л. 55 об.

[28] Там же. Д. 1, л. 52 об.

[29] Там же. Ф. 227, оп. 1, д. 1, л. 28 об.

[30] Там же. Ф. 153, оп. 8, д. 1550.

[31] Там же. Д. 891, л. 91.

[32] Там же. Д. 496, л. 9.

[33] Там же. Д. 3, лл. 2—4.

[34] Там же. Ф. 228, оп. 1, д. 1, л. 1; Там же, ф. 153, оп. 8, д. 4; Там же, ф. 227, оп. 1, д. 1.

[35] Там же. Ф. 153, оп. 8, д. 129, л. 172.

[36] Там же. Оп. 10, д. 2, л. 2.

[37] Там же.

[38] Там же. Л. 2 об.

[39] Гл.: Островитянов К.В. Думы о прошлом. Из истории первой русской революции, большевистского подполья и октябрьских боев против контрреволюции в Москве. М., 1967. С. 67—68.

[40] Чуткий А.І. Самоорганізація студентства Київського комерційного інституту як одна із складових історії зародження профспілкового руху в Україні // Гілея. 2011. Вип. 51 (№ 9). С. 40—46; Чуткий А.І. Етнічний склад студентського контингенту та національне питання в Київському комерційному інституті // Література та культура Полісся. Вип. 65. Ніжин, 2011. С. 126—138; Чуткий А.І. Викладацькі кадри та склад студентства Вищих комерційних курсів у Києві (1906—1908 рр.) // Література та культура Полісся. Вип. 63. Ніжин, 2011. С. 218—229; Чуткий А.І. Еволюція студентського контингенту Київського комерційного інституту // Київська старовина. 2010, № 1. С. 35—45; Чуткий А.І. Український студентський гурток у Київському комерційному інституті (1908 — 1914 рр.) // Пам'ятки: археографічний щорічник. Т. 8. К., 2008. С. 122—128.

[41] ГАК. Ф. 153, оп. 10, д. 2, л. 2 об.

[42] Там же. Л. 3.

[43] Там же. Л. 3 об.

[44] Там же.

[45] Там же.

[46] ЦГИАК. Ф. 274, оп. 4, дд. 72, 463; Там же, ф. 275, оп. 1, д. 72.

[47] ГАК. Ф. Р—871, оп. 2, д. 126, л. 45.

[48] Там же. Ф. 153, оп. 10, д. 2, л. 3 об.

[49] Там же. Оп. 8, д. 496, лл. 17—18.

[50] Там же. Л. 72.

[51] Известия Киевского коммерческого института. К., 1913. Кн. XVII. С. 1.

[52] ГАК. Ф. 153, оп. 1, д. 52, л. 122.

[53] Там же. Оп. 8, д. 676. л. 7.

[54] Там же. Д. 319, л. 25.

[55] Там же. Л. 30.

[56] Полонська-Василенко Н. Революція 1917: спогади // Український історик. 1989. Вип. 1—4. С. 122.

[57] Там же.

[58] Чуткий А.І. Питання зміни професорської культури в Києві на початку XX ст.: «справа Є.Д.Сташевського» та припинення М.В.Довнар-Запольським роботи в Київському комерційному інституті // Гілея. 2011. № 49 (№ 7). С. 77—83.

[59] Полонська-Василенко Н. Революція 1917: спогади // Український історик. 1989. Вип. 1—4. С. 123.

[60] Ульяновський В., Короткий В., Скиба О. Останній ректор Університету Святого Володимира Євген Васильович Спекторський. К., 2007. С. 184—186; Спекторский Е.В. Столетие Киевского университета св. Владимира. К., 2007. С. 90.

[61] ГАК. Ф. 16, оп. 1, д. 52, лл. 222—222 об.

[62] Там же. Л. 221.

[63] Там же. Ф. 153, оп. 11, д. 73, л. 36.

[64] Там же. Ф. Р—871, оп. 2, д. 1472, л. 24 об.

[65] Там же. Ф. Р—871, оп. 2, д. 354, л. 91.

[66] Гл.: Alma mater: Університет св. Володимира напередодні та в добу Української революції 1917—1920. матеріали, документи, спогади / Упоряд. В.А.Короткий, В.І.Ульяновський. Кн. 1. К., 2000. С. 140—191.

[67] ГАК. Ф. 153, оп. 1, д. 52.

[68] Там же. Ф. Р—871, оп. 2, д. 344, л. 14 об.